Источник: "Звязда" - 2013-06-22

# СВАЕ СУПРАЦЬ СВАІХ

## Ці засвоілі мы філасофскія набыткі Васіля Быкава?

Сёння незвычайны дзень... Нават дзіўна, як у адным дні можа спалучацца столькі супрацьлегласцяў, узаемавыключальных фактаў. 22 чэрвеня — не толькі дзень летняга сонцастаяння, як сімвала жыцця, перамогі святла над цемрай, таму што самы доўгі дзень у годзе акурат сёння. 22 чэрвеня — гэта яшчэ дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны і дзень смерці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. І сёлета вось ужо 10 гадоў, як яго не стала.

І гэта таксама быццам бы нейкі сімвал — сысці з жыцця ў дзень пачатку вайны. Быццам апошні ўчынак, якім гэты вялікі беларус хацеў яшчэ раз сцвердзіць, што вайна — гэта нешта антычалавечае, чужое, негуманнае і дзікае... Зрэшты, уся яго творчасць і ўсё яго жыццё сцвярджалі гэта. Ціхім сціплым голасам сумленнага беларуса Васіль Быкаў даводзіў гуманістычныя каштоўнасці да людзей, гаварыў ім праўду пра вайну, савецкую ўладу, пра тое, што перад непераадольнымі абставінамі, у любой экзістэнцыйнай сітуацыі чалавек і становіцца самімі сабой, і становіцца сабе



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

чужым — у ім пачынаюць праяўляцца якасці, яму самому пра сябе дагэтуль невядомыя. Быкаў — вялікі псіхолаг, выдатны філасаф. Беларускі, інтэрнацыянальны, наднацыянальны. Дзякуючы яго творчасці сёння мы зусім па-іншаму глядзім на літаратуру, на гераізм, на вартасць чалавечага жыцця, на вайну не супраць ворагаў, а вайну — унутры нас, вайну сваіх супраць сваіх...

### Быкаў у кожным з нас

Для любога падлетка, калі толькі ён пачынае цікавіцца беларушчынай, творчасць Васіля Быкава з'яўляецца этапнай. Памятаю гэтыя школьныя ўрокі беларускай літаратуры з маёй цудоўнай настаўніцай Таццянай Уладзіміраўнай, якая пра Васіля Быкава расказвала не пафасна і кранальна. Памятаю «адкрытыя ўрокі», калі мне давялося на вялізную аўдыторыю распавядаць пра «Знак бяды». Памятаю, як чытаючы «Жураўліны крык», я плакала, таму што разумела: выйсця няма, усе загінуць. А Быкаў напісаў пра гэта так лаканічна і адначасова дэталёва, напісаў так трагічна, што адчуванне таго, што ў свеце пануе несправядлівасць і зло, нейкае часам не бачнае, але паўсюднае, маштабнае, апаноўвалі з жудаснай сілай. І хацелася бегчы ад гэтага зла, крычаць, плакаць. Маўляў, вунь, вы ж паглядзіце, жыццё такое простае і цікавае, што ж вам яшчэ трэба, людзі?! А, відаць, варагаваць, залежаць і падначальваць — настолькі ж у прыродзе чалавека, наколькі не. Усё вырашае толькі, чаму пашчасціць перамагчы...

Не ведаю, але, хутчэй за ўсё, каб я ў школьныя часы не чытала Васіля Быкава, то была б зусім іншым чалавекам сёння. Узгадваючы Васіля Уладзіміравіча, яго сучаснікі кажуць, што галоўным у літаратуры ён лічыў не талент, а чалавечае сумленне. У Быкава было і першае, і другое. І яшчэ нашмат большае. І першае, і другое ёсць у яго кнігах. І гэта не можа не паўплываць. Калі мы толькі захочам, Быкаў будзе ў кожным з нас. І, магчыма, мы станем трохі лепшымі.

На вечарыне памяці пісьменніка, якую днямі ладзілі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа НАН Беларусі, пра Васіля Быкава расказвалі яго сябры. Гаварыў, напрыклад, генерал-маёр авіяцыі Анатоль Сульянаў, які з пісьменнікам не служыў, але пасябраваў ужо ў мірным жыцці. Лейтматывам у яго прамове было тое, якім неверагодна сціплым чалавекам, «не ныцікам» быў Васіль Быкаў. У Васіля Уладзіміравіча былі цяжкія прыступы астмы, але ён «напружваў» сяброў, прасіў аб дапамозе толькі ў самыя-самыя крытычныя моманты. Затое сам заўсёды быў рады дапамагаць, клапаціўся пра людзей, якія былі побач. Непатрабавальны, не кідкі, ён ніколі не выхваляўся. На выступленнях перад курсантамі ваеннага вучылішча Быкаў, які прайшоў увесь фронт, капаў акопы, ваяваў у артылерыі і пяхоце, адступаў да Варонежа, 2 разы быў паранены, а ў 1944-м нават лічыўся забітым, ніколі не выхваляўся сваімі подзвігамі і больш, наогул, расказваў пра вайну ў цэлым, пра подзвігі іншых, чым ужываў уласны займеннік «я».

У сувязі з гэтым, вядома ж, падумалася: а хто сёння расказвае пра вайну сённяшнім курсантам?

Часам перачытваеш яго творы і думаеш: а ці засвоілі мы нешта з яго ўрокаў? Мы памятаем яго, шануем. Спадзяюся, заўжды так будзе. Але ці засвоілі мы, усе мы, кожны з нас?..

### Думаць — доўгая дарога

Паэт Анатоль Вярцінскі, які таксама выступаў на вечарыне памяці Быкава ў бібліятэцы, расказаў пра Васіля Уладзіміравіча шмат цікавага, шмат нейкіх напаўпобытавых жыццёвых дробязяў, якія толькі і могуць расказаць пра рэальнага чалавека, а не пра класіка, творы якога вывучаюцца па школьнай праграме. Хаця слухаеш гэтыя гісторыі з жыцця і пераконваешся: Быкаў быў заўжды адным і тым жа, сумленным, простым, шчырым чалавекам і ў жыцці, і ў творчасці. Найбольш запомнілася гісторыя з апытанкай для газеты. Вядомых пісьменнікаў, у ліку якіх былі Быкаў, Шамякін, Кудравец ды сам Вярцінскі, папрасілі адказаць на просценькія пытанні.

— І вось мы на пытанні кшталту «Ці любіце вы сваё імя?» спрабавалі адказаць грунтоўна і сур'ёзна, — распавядае Анатоль Вярцінскі. — А Быкаў адказаў проста, лаканічна і з гумарам. І праўда, як на такія пытанні можна было адказваць усур'ёз, я цяпер думаю.

Адказы Васіля Быкава на гэтую фрывольную апытанку сапраўды захапляюць. Прыкладам, на пытанне, якія колер валасоў і вачэй вам падабаюцца найбольш, ён адказаў: «Усе колеры добрых людзей». На пытанне «якой павінна быць жанчына вашай мары?» адказаў: «Цудоўная». Пра свой улюбёны занятак адказаў лаканічна «Думаць». Вось гэта дасціпнасць, вось гэта востры розум.

А мне падумалася, каб ва ўсіх людзей на планеце ўлюбёным заняткам было «думаць», то чалавецтва пазбегла б стольківх праблем, глабальных катаклізмаў, войнаў, канфліктаў, непаразуменняў... Глядзіш на партрэт Быкава, на яго пранікнёны, заўжды заклапочаны твар (нават сябры сведчаць, што смяяўся ён даволі рэдка), і здаецца, што ён усё гэта ўсведамляе. Пра нас. У чым мы памыляемся, што мы робім не так...

Памятаю, як зноў-такі ў школе чытала яго аўтабіяграфію «Доўгая дарога дадому». І думала. Думала пра тое, што гэты чалавек (які тады яшчэ быў жывы!) — сваёй сціплай упартасцю, прынцыповасцю і дабрынёй перамог усё. Прынамсі, унутрана перамог. Думала, што ён вучыўся ў маім родным Віцебску — як ён вучыўся, пра што сам разважаў, якія былі яго ўлюбёныя мясціны ў горадзе. Тады для мяне было адкрыццём, што ён увогуле вучыўся тут маляванню. Памятаю, адразу пабегла ў горад шукаць той будынак, дзе знаходзілася мастацкая школа, куды ён хадзіў. І цяпер ганаруся, што ў пэўным сэнсе Віцебск — таксама горад Васіля Быкава. І цяпер ганаруся, што Васіль Быкаў — наш з вамі суайчыннік, беларус, якому ніколі не было абыякава. І нам не будзе, праўда?..

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**